Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

26 студзеня 2017 года, № 1 (2169)

ПАДЗЕЯ

Фота Васіля КУЗЬМЧКІНА

Раскрыць навуковы патэнцыял моладзі

МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫ КАНТЭНТ

Дадзеная публікацыя ўтрымлівае відэакантэнт. Падрабязнасці на с. 4

БДУ стаў пляцоўкай заключнага этапу фэстывалю моладзевай універсітэцкай навукі, які сабраў 17 студзеня старшакласнікаў, студэнтаў і маладых навукоўцаў. На ім былі падведзены вынікі цыкла мерапрыемстваў і вызначаны мэты на 2017 год – год навукі.

Фэстываль моладзевай універсітэцкай навукі арганізаваны Міністэрствам адукацыі Беларусі з мэтай стымулявання цікавасці і прыцягнення ўвагі да навуковай дзейнасці навучэнцаў і студэнтаў і стаў адным з самых маштабных навуковых мерапрыемстваў 2016 года. У яго рамках былі прадстаўлены апошнія інавацыйныя распрацоўкі маладых навукоўцаў, праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прайшлі выставы тэхнічнай творчасці і дызайнерскіх распрацовак моладзі, майстар-класы, конкурсы сярод студэнтаў і маладых навукоўцаў, экскурсіі на прамысловыя прадпрыемствы, кірмаш вакансій і лекцыі беларускіх навукоўцаў. Фэст моладзевай універсітэцкай навукі – гэта магчымасць не толькі паказаць свае веды і зацікаўленасць у навуцы, але і прадставіць сябе будучаму працадаўцу, уліцца ў навуковыя даследаванні адразу пасля ўніверсітэта.

На закрыцці фэсту ў Ліцэі БДУ працавалі 12 інтэрактыўных зон, дзе ўніверсітэты краіны дэманстравалі свае навуковыя дасягненні і тэхнічную абсталяванасць. Па холе ездзілі маленькія робаты – вынаходства Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. 3D-прынтар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта друкаваў самы сапраўдны стул, на які, праўда, сесці змагла б хіба што дзюймовачка. «А яшчэ мы друкуем магніцікі на халадзільнік», – распавёў адзін з выкладчыкаў ВНУ. «А ежу можаце раздрукаваць? – цікаўлюся. – «Лёгка, – усміхаецца мужчына, – але гэта ўжо не наш профіль». А побач студэнты БДУІР паказвалі настольную лямпу, якую можна ўключыць з дапамогай мабільнага прыкладання, і інавацыйную сігналізацыю для машыны.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт прадстаўлялі біялагічны, хімічны і юрыдычны факультэты. Юрфак арганізаваў на сваім стэндзе крыміналістычную лабараторыю. Тут любы ахвотнік мог адчуць сябе следчым. *Аспірант* ***Руслан Ціханенка*** паказваў, як складаюць фотаробат, чым рабаўнікі могуць узламаць дзверы і як шукаць схаваныя прадметы з дапамогай бараскопа. Таксама юрыдычны факультэт інсцэнаваў месца злачынства. За жоўтай стужкай трагічна сканала лялька, побач з ёй – сляды крыві і рэчавыя доказы. «Мы вучым студэнтаў цалкам праводзіць агляд месца здарэння, навучаем вызначаць механізм утварэння крыві і апісваць гэта ўсё ў пратаколе. У нас ёсць агнястрэльная зброя, якую студэнты вучацца канфіскоўваць і аналізаваць. Таксама мы выкарыстоўваем сучасныя тэхналогіі, такія як далямер і 3D-фотаапарат». – «Гэта дзе такому навучаюць?» – некаторыя ліцэісты здзівіліся, што вучыцца на юрфаку так цікава.

«На стэндзе біялагічнага факультэта прадстаўлены адразу некалькі калекцый, – паказвае *выкладчык* ***Ілья Ільюшонак*** чашу Петры з яркімі малюнкамі на ёй, – замест палатна выкарыстоўвалася шчыльнае пажыўнае асяроддзе, замест фарбы – бактэрыі розных колераў». Таксама біяфак дэманстраваў культуры клетак раслін, выгадаваныя імі грыбы і экспанаты, якія даюць уяўленне пра анатомію і развіццё жывых арганізмаў. Паказвалі і фотакалекцыю факультэта. Яна складаецца з цікавых анатамічных элементаў чалавечага арганізма ў буйным павелічэнні і фатаграфій рэдкіх раслін, зробленых студэнтамі і супрацоўнікамі факультэта. «На аснове ўсяго гэтага мы паказваем, што навука, у прыватнасці біялогія, можа быць цікавай, разнастайнай, вясёлай і займацца ёй прыемна», – кажа Ілья Мікалаевіч.

Тое, што навука – занятак вельмі цікавы, не выклікае сумневаў і пры падыходзе да іншага стэнда БДУ. На стэндзе хімічнага факультэта красуюцца колбачкі з рознакаляровымі вадкасцямі і слоічкі з загадкавымі парашкамі. *Выкладчык хімічнага факультэта* ***Віталь Кондраў*** паказваў хімічныя эксперыменты. Паабяцаўшы просты, але вельмі відовішчны эксперымент, ён растварaў у колбе парашкі і змешваў вадкасці. Простым гэты эксперымент неспрактыкаванаму гледачу не здаўся, а вось у відовішчнасці яму не адмовіш. Калі падрыхтоўка была завершана, вадкасць у колбе пачала змяняць свой колер: вось яна сіняя, потым плаўна становіцца празрыстай, затым аранжавай, і раптам ізноў сіняя. «Гэта завецца хімічны гадзіннік», – тлумачыць выкладчык, адначасова рыхтуючы наступны эксперымент. «Вось, на эканамфаку такога не ўбачыш», – заўважыла дзяўчына побач.

У рамках фэсту быў арганізаваны круглы стол з прадстаўнікамі

(Заканчэнне на с. 2)

У нумары:

ФІЗІКІ БДУ ПРАЦЯГНУЦЬ ПРАЦУ Ў ЦЕРН

У НДІ ядзерных праблем завяршыў працу семінар «LHC Days in Belarus 2017»

Стар. 2

У СВЯТЛЕ МІЖНАРОДНЫХ РЭЙТЫНГАЎ

У семінары «Міжнародныя рэйтынгі як інструмент інтэрнацыяналізацыі ўніверсітэтаў» узяла ўдзел рэгіянальны дырэктар брытанскага агенцтва QS

Стар. 3

ДЛЯ ЧАГО ПАТРЭБНЫЯ ТУРНІКЕТЫ Ў БДУ?

Ахоўнікаў, якія правяраюць дакументы на ўваходзе на тэрыторыю кампуса і карпусоў БДУ, заменяць турнікеты і сістэма відэаназірання

Стар. 4

Весткі з рэктарата

ЭЛЕКТРОННАЯ БІБЛІЯТЭКА БДУ стала лідарам сярод бібліятэк краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы па апошніх дадзеных рэйтынгу RankingWeb of Repositories. У агульнасусветным рэйтынгу ЭБ БДУ размясцілася на 135 месцы, а ў катэгорыі бібліятэк універсітэтаў заняла 127 месца сярод усіх 2300 інфармацыйных рэсурсаў. Таксама ў рэйтынгу прадстаўлены ўніверсітэцкі рэпазітарый БНТУ (агульнае 470 месца), электронныя бібліятэкі БДЭУ (751) і ГрДУ (800).

ПЕРШАЯ практычная канферэнцыя «Crisis management: практыка кіравання персаналам у складаных сітуацыях» прайшла 21 студзеня ў БДУ. Яе ўдзельнікамі сталі эксперты ў галіне HR, кіраўнікі арганізацый, HR-спецыялісты-практыкі з беларускіх і замежных кампаній. Яны абмеркавалі неабходнасць радыкальных змен у бізнес-дзейнасці, адаптацыйныя метады ўкаранення змен у працоўны калектыў, прынцыпы эфектыўнага менеджменту ў крызісных умовах.

Арганізатарам канферэнцыі выступіла ўпраўленне кадраў БДУ. HR-партнёр – партал TUT.by.

ІНТЭРНАТ № 3 БДУ (вул. Курчатава, 6) заняў другое месца ў гарадскім аглядзе-конкурсе ў намінацыі «Найлепшы студэнцкі інтэрнат». Першае месца атрымаў інтэрнат БДЭУ, а трэцяе месца інтэрнат БДУФК. Усяго ў конкурсе ўдзельнічалі 353 мінскія інтэрнаты розных формаў уласнасці. З іх у 118 інтэрнатах пражываюць студэнты і навучэнцы ПТНУ і ССНУ.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Фізікі БДУ працягнуць працу ў ЦЕРН

У Навукова-даследчым інстытуце ядзерных праблем БДУ завяршыў працу семінар «LHC Days in Belarus 2017».

На гэтым навуковым форуме падводзілі колькасныя і якасныя вынікі працы беларускіх навукоўцаў у эксперыментах на Вялікім адронным калайдары (ВАК) у Еўрапейскай арганізацыі ядзерных даследаванняў (ЦЕРН, Швейцарыя). У ім прынялі ўдзел больш за 30 навукоўцаў з НДІ ЯП, ЦЕРН, Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў (АІЯД, г. Дубна, Расія), вядучыя супрацоўнікі беларускіх навуковых арганізацый у галіне фізікі высокіх энергій. Таксама ў БДУ былі запрошаны афіцыйныя прадстаўнікі сектара міжнародных адносін ЦЕРН прафесары *Крыстоф Шэфер* і *Тадэвуш Куртыка*.

Падчас форуму былі прадстаўлены 22 даклады, у якіх падрабязна разгледжаны апошнія дасягненні беларускіх навукоўцаў, атрыманыя ў рамках міжнародных калабарацый CMS і ATLAS. Навукоўцы абмеркавалі шырокае кола пытанняў удзелу навукова-даследчых арганізацый нашай краіны ў эксперыментах на ВАК. У прыватнасці, агаворваліся ўмовы ўдзелу навукоўцаў НДІ ЯП БДУ ў эксперыментальным праекце UA9 і падпісанне ў найбліжэйшай перспектыве адпаведнага мемарандума.

Загадчык лабараторыі тэарэтычнай фізікі Інстытута фізікі НАН Беларусі *Юрый Курачкін* падрыхтаваў падрабязны аналіз і прэзентацыю, дзе высока ацаніў прафесіяналізм беларускіх навукоўцаў. Гэта абумоўлена наяўнасцю навуковай школы фізікаў – спецыялістаў у галіне фізікі элементарных часціц, дзяржаўнай фінансавай падтрымкай навуковых даследаванняў у рамках адпаведных дзяржаўных навукова-даследчых праграм і праектаў. «Сёння беларускія фізікі паўнапраўна ўдзельнічаюць і ў міжнародных праектах», – адзначыў Курачкін. Супрацоўнікі Цэнтра фізікі часціц і высокіх энергій НДІ ЯП БДУ таксама зрабілі істотны ўнёсак у стварэнне вузлоў і дэталяў дэтэктара ATLAS. Дарэчы, гэты апарат складаецца з кампактнага ўнутранага дэтэктара, у якім адсочваюцца траекторыі часціц, за ім ідуць каларыметры, якія вымяраюць іх энергію, а звонку размешчаны мюонныя дэтэктары. Самая ўражлівая характарыстыка ATLAS – гэта яго памер. Нават па сучасных мерках гэта велізарны дэтэктар. Яго даўжыня складае 43 метры, а дыяметр – 22 метры. Зрэшты, дзякуючы досыць ажурнай канструкцыі поўная вага дэтэктара не такая вялікая, як у CMS, – усяго 7 тысяч тон.

Падчас працы семінара адбыліся сустрэчы афіцыйных прадстаўнікоў сектара міжнародных адносін ЦЕРН з першым прарэктарам БДУ акадэмікам Алегам Івашкевічам, прарэктарам па навуковай рабоце БДУ Васілём Сафонавым, намеснікам старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргеем Кіліным.

На семінары было прынята рашэнне пра штогадовае правядзенне семінараў «LHC Days in Belarus» у БДУ з удзелам навукоўцаў ВНУ і інстытутаў НАН Беларусі, а таксама прадстаўнікоў ЦЕРН і АІЯД.

Жанна ВАСАНСКАЯ

ПАДЗЕЯ

Раскрыць навуковы патэнцыял моладзі

(Заканчэнне. Пачатак на с. 1)

Міністэрства адукацыі, маладымі навукоўцамі, арганізатарамі студэнцкай навукі, аспірантамі і дактарантамі. Удзельнікі абмяркоўвалі перспектывы развіцця саветаў маладых навукоўцаў, спосабы павышэння іх іміджу, адсутнасць камерцыялізацыі навуковых інавацый і невялікі працэнт абароны кандыдацкіх дысертацый.

Падчас дыскусіі былі не толькі абмеркаваны праблемы, але і вызначаны шляхі рашэння некаторых з іх. Так, для павышэння іміджу навукоўцаў было вырашана ўдасканаліць формы ўдзелу ў даследчых праектах, грантах, школах, а таксама праводзіць міжнародныя навуковыя школы з прыцягненнем аспірантаў і вядомых навукоўцаў з іншых краін. Каб палепшыць камерцыялізацыю інавацый, было прапанавана арганізоўваць чытанне лекцый на гэту тэму, а таксама ініцыяваць стварэнне моладзевых навуковых інавацыйных цэнтраў для падрыхтоўкі кадраў.

Таксама ўсе ахвотнікі маглі наведаць навукова-папулярныя лекцыі беларускіх навукоўцаў, якія на простай мове распавялі пра сваю складаную працу. *Акадэмік НАН Беларусі* ***Аляксандр Міхалевіч*** прадставіў даклад пра ядзерную энергетыку. *Кандыдат біялагічных навук Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі* ***Васіль Панкратаў*** выступіў з лекцыяй «Эвалюцыйная генетыка чалавека», распавёўшы пра паходжанне беларусаў, іх схільнасці да хвароб і шматлікае іншае. На лекцыі «Пытанні сучаснай хіміі» *загадчык лабараторыі растворaў цэлюлозы і прадуктаў іх перапрацоўкі НДІ ФХП БДУ* ***Дзмітрый Грыншпан*** распавёў пра такія сучасныя распрацоўкі нашых навукоўцаў, як ядомая ўпакоўка і ўдасканаленыя фільтры для вады. Пра распрацоўку і падрыхтоўку да запуску ўніверсітэцкага нанаспадарожніка можна было даведацца на лекцыі загадчыка кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій ФРКТ БДУ ***Уладзіміра Саечнікава***.

На ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным вынікам працы фэсту, *прарэктар па навуковай рабоце БДУ* ***Васіль Сафонаў*** пажадаў навукоўцам поспехаў і выказаў зацікаўленасць у тым, каб моладзь рэалізоўвала свой патэнцыял у сценах універсітэта.

За актыўны ўдзел у арганізацыі мерапрыемстваў фэсту моладзевай навукі і навукова-даследчай працы ўстаноў вышэйшай адукацыі маладых навукоўцаў узнагародзілі граматамі міністэрства адукацыі. *Першы намеснік міністра адукацыі* ***Вадзім Богуш*** адзначыў: «На працягу 2016 года ў моладзі была добрая магчымасць пагутарыць са старэйшымі калегамі, атрымаць досвед і прадставіць свае распрацоўкі і дасягненні. І, напэўна, гэта тыя зерні, якія дадуць рост і сёлета. Мерапрыемствы фэсту вырашылі шмат задач, звязаных з прыцягненнем моладзі ў навуку. Мы будзем актыўна працягваць падтрымку падобных мерапрыемстваў. Хачу падкрэсліць, што мы не заканчваем наш фэст, а падводзім вынікі таго, што было зроблена ў 2016 годзе, і ставім задачы на 2017».

Як вядома, 2017 год абвешчаны ў Беларусі годам навукі з мэтай павышэння яе ролі ў выкананні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, стварэння спрыяльных умоў для захавання навуковага патэнцыялу, фарміравання міжнароднага іміджу Беларусі як краіны з высокім узроўнем інтэлектуальнага і чалавечага капіталу.

Дар'я КОЎЗА

РАСПРАЦОЎКІ

Новы прэпарат супраць інфаркту

У лабараторыі біяхіміі лекавых прэпаратаў НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта НАН Беларусі Уладзіміра Шкуматава і намесніка генеральнага дырэктара фармацэўтычнай кампаніі дацэнта Вадзіма Сенчука распрацавалі новую тэхналогію атрымання субстанцыі лекавага прэпарата крэацінфасфату.

Прапанаваны інавацыйны метад безадходны і экалагічна бяспечны, паколькі забяспечваецца замкнёны тэхналагічны цыкл. Пры вытворчасці субстанцыі адсутнічаюць выкіды пылавых, газападобных, вадкіх і цвёрдых прадуктаў у атмасферу. Перавага новай тэхналогіі ў больш высокім выхадзе мэтавага прадукту – крэацінфасфату. Па ступені чысціні, утрыманні цяжкіх металаў, эфектыўнасці, бяспецы прэпарат адпавядае ўсім патрабаванням і мае ніжэйшы кошт, чым італьянскі аналаг.

Крэацінфасфат шырока выкарыстоўваецца ў кардыялогіі, паляпшае метабалізм міякарда і цягліцавай тканкі, валодае кардыяпратэктарным дзеяннем. Прэпарат прызначаны для лячэння вострага інфаркту міякарда, хранічнай сардэчнай недастатковасці, інтрааперацыйнай ішэміі міякарда, інтрааперацыйнай ішэміі канечнасцяў, вострага парушэння мазгавога кровазвароту. Акрамя таго, крэацінфасфат шырока ўжываецца ў спартыўнай медыцыне для прафілактыкі развіцця сіндрому фізічнага перанапружання і паляпшэння адаптацыі да экстрэмальных фізічных нагрузак.

Начны дазор

У БДУ распрацаваны праект сістэмы дыстанцыйнага кардыяманіторынгу «Начны дазор», якая дазваляе кантраляваць здароўе людзей у начны час сутак.



Гэта навуковая ідэя належыць *кандыдату тэхнічных навук дацэнту кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ* ***Валянціну Ярмалінскаму***. Над яго ажыццяўленнем працуюць навукоўцы БДУ, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама супрацоўнікі беларускай і расійскай прыборабудаўнічых кампаній.

Рэалізацыя праекта дазволіць арганізаваць новы ўзровень аказання медыцынскай дапамогі, заснаванай на адначасовым узаемадзеянні службаў медыцынскай дапамогі, надзвычайных сітуацый, праваахоўных органаў і інш. Сістэма накіравана на прафілактыку сардэчна-сасудзістых захворванняў у людзей, змешчаных у групе рызыкі. У прыватнасці, гаворка ідзе пра забеспячэнне недарагімі прыборамі хворых, якія маюць патрэбу ў хатнім і начным кардыяманіторынгу, бо праходзяць постінфарктную рэабілітацыю або перанеслі аортакаранарнае шунтаванне і інш. Адносяцца да групы рызыкі і спартсмены. Ім важна кантраляваць стан сэрца ў першыя гадзіны пасля трэніроўкі. А падчас спаборніцтваў важны начны кантроль стану арганізма.

Пацыенты будуць знаходзіцца пад пільным кантролем мабільных прыкладанняў, якія ўсталёўваюцца на смартфонах карыстальнікаў, а таксама праграм, што працуюць на галаўным web-серверы. Рэагаванне экстранных службаў будзе адбывацца пасля атрымання трывожнага сігналу ад аператара ці непасрэдна кардыягаджэта. Гэты апарат уяўляе сабою бесправадны кішэнны прыбор, які робіць даступным здыманне ЭКГ, экспрэс-дыягностыку і самакантроль узроўню псіхаэмацыйнага і фізічнага стрэсу. Прыбор выяўляе вегетатыўныя парушэнні, забяспечвае кантроль дынамікі фізічнай працаздольнасці пры постінфарктнай рэабілітацыі і фізічнай самападрыхтоўцы.

Функцыянаванне сістэмы дазволіць паменшыць лік раптоўных смерцяў, якія адбываюцца з-за адсутнасці хуткага аказання медычнай дапамогі; павялічыць эфектыўнасць выкладання аздараўленчай фізічнай культуры ва ўстановах адукацыі; забяспечыць камфортны і даступны для неспецыялістаў самакантроль узроўню здароўя.

Мабільныя прыкладанні для карыстальніка і ўрача дапамогуць ім знаходзіцца ў цесным кантакце адзін з адным, незалежна ад адлегласці. Пераслаць карцінку ЭКГ, сардэчнага рытму, табліцу разліковых параметраў можна будзе і ў выпадку знаходжання за мяжой, у камандзіроўцы, на дачы, у службовым офісе. Рэкамендацыі ўрача паступяць па Skype, Viber, электроннай пошце.

У наш час атрыманы першыя вынікі тэрміновага і дыстанцыйнага маніторынгу стану сэрца ў студэнтаў. Яны праходзяць тэсціраванне ў лабараторыі, на занятках фізічнай культурай і спортам, у гадзіны начнога сну, пры працы за камп'ютарам і інш. Фармаваная база дадзеных служыць для адпрацоўкі алгарытмаў працы праграмнага забеспячэння. Серыйную вытворчасць прыбораў плануецца пачаць сёлета на прыборабудаўнічых кампаніях Беларусі (ТДА «Дыятронік») і Расіі (ЗАТ «Элта»).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

У святле рэйтынгаў

МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫ КАНТЭНТ

У БДУ ўпершыню прайшоў семінар «Міжнародныя рэйтынгі як інструмент інтэрнацыяналізацыі ўніверсітэтаў», на якім выступіла Зоя Зайцава – рэгіянальны дырэктар па Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі кампаніі Quacquarelli Symonds (QS).

У ім ўдзельнічалі больш за сто супрацоўнікаў БДУ і іншых ВНУ краіны, якія адказваюць за ўдзел універсітэтаў у міжнародных рэйтынгах і прасоўванне іміджу сваіх навучальных установ. Рэктар БДУ акадэмік *Сяргей Абламейка* адзначыў, што ўдзел у сусветных рэйтынгах з'яўляецца адным з прыярытэтаў, бо менавіта на іх звяртаюць увагу замежныя абітурыенты, калі абіраюць ВНУ, а таксама замежныя партнёры, калі збіраюць каманду для вялікіх навуковых праектаў.

Прарэктар па вучэбнай рабоце *Алякцей Толсцік* падзяліўся багатым досведам удзелу БДУ ў вядучых сусветных рэйтынгах, расказаў пра асаблівасці кожнага з іх. Дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ *Уладзімір Кулажанка* распавёў пра ролю бібліятэк у рэйтынгавых стратэгіях, а начальнік ЦІТ Юрый Варатніцкі – пра стратэгію інфарматызацыі ўніверсітэта.

Прадстаўнік QS *Зоя Зайцава* распавяла пра галоўныя фактары прасоўвання ўніверсітэтаў на сусветнай арэне і заклікала прадстаўнікоў беларускіх ВНУ больш актыўна ўдзельнічаць у міжнародных рэйтынгах, бо, напрыклад, у рэйтынг QS уключаныя толькі БДУ (354 месца) і БНТУ (701+).

Міжнародная рэпутацыя ВНУ грунтуецца на шматлікіх фактарах – замежныя студэнты звяртаюць увагу не толькі на кошт, але і на якасць навучання, перспектывы працаўладкавання пасля заканчэння, разнастайнасць студэнцкага жыцця, магчымасць браць удзел у навуковых даследаваннях, а таксама на прадстаўленасць інфармацыі на сайце, адзінства ў візуальных камунікацыях, наяўнасць фірмовага стылю, выкарыстанне шматлікіх каналаў камунікацыі (сайты, сацыяльныя сеткі, каналы на YouTube і інш.).

Зоя Зайцава падкрэсліла, што рэпутацыя не будуецца хутка і лёгка – гэта доўгатэрміновы працэс, у якім унёсак кожнага члена калектыву мае важнае значэнне. Універсітэты павінны быць настойлівымі ў данясенні сваіх ідэй на сусветнай арэне, дзе ў апошні час канкурэнцыя ўзрастае вялікімі тэмпамі.

Павел САЛАЎЁЎ

Лідар філасофскай школы

Выдатнаму навукоўцу, доктару філасофскіх навук, загадчыку кафедры філасофіі і метадалогіі навукі **Анатолю ЗЕЛЯНКОВУ** споўнілася 70 гадоў.

Усё творчае і прафесійнае жыццё А. І. Зелянкова звязана з нашым універсітэтам. Студэнт, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар, які ўзначальвае прафесарскі сход БДУ, – ён паспяхова прайшоў усе прыступкі акадэмічнай кар'еры, адзначаючы кожную з іх значным унёскам у развіццё айчыннай навукі і адукацыі. Бліскучыя абароны кандыдацкай і доктарскай дысертацый, праца на пасадах прарэктара і дэкана, нязменнае кіраўніцтва кафедрай філасофіі і метадалогіі навукі з 1991 г. сведчаць пра яго выключныя здольнасці.

А. І. Зелянкоў – лідар мінскай філасофска-метадалагічнай школы. Яго працы апублікаваны за мяжой, ён прадстаўляў Беларусь на міжнародных навуковых форумах і выступаў з лекцыямі у Германіі, ЗША, Кітаі, Расіі, Украіне, Польшчы і інш.

Вынікі, дасягнутыя Анатолем Зелянковым у навукова-педагагічнай дзейнасці, атрымалі заслужанае прызнанне. Ён лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, дзейны член Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў (г. Санкт-Пецярбург), акадэмік Украінскай акадэміі палітычных навук (г. Кіеў). Міжнародны біяграфічны цэнтр пры Кембрыджскім універсітэце (Вялікабрытанія) адзначыў Анатоля Зелянкова Ганаровай узнагародай XX стагоддзя за дасягненні ў галіне філасофіі і метадалогіі навукі. Ён узнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі Беларусі» і ганаровай граматай Нацыянальнага сходу РБ.

Калектыў кафедры выказвае шчырую падзяку Анатолю Ізотавічу за мудрае кіраўніцтва, чалавечнасць, увагу, падтрымку і сардэчна віншуе яго з юбілеем!

Гісторыя БДУ ў лічбавым фармаце

У БДУ запрацаваў сайт-фотаархіў, дзе прадстаўлена больш чым 20 тысяч фотаздымкаў, якія адлюстроўваюць амаль стогадовую гісторыю ўніверсітэта.



Самыя раннія здымкі адносяцца да пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Фота распавядаюць пра першыя заняткі, канферэнцыі, іспыты і жыццё моладзі.

Архіў тэматычна падзелены на тры катэгорыі: **«Мерапрыемствы»**, **«Аб'екты»** і **«Персаналіі»**. У іх адлюстраваны найбольш значныя падзеі з гісторыі і сучаснасці БДУ, візіты палітычных і грамадскіх дзеячаў, кіраўнікоў замежных дзяржаў, акцыі з удзелам студэнтаў і г. д. Тут прадстаўлены таксама выявы навучальных карпусоў, інтэрнатаў, скульптур універсітэцкага гарадка. У раздзеле «Персаналіі» размешчана фотагалерэя рэктараў БДУ, а таксама акадэмікаў, членаў-карэспандэнтаў, ганаровых прафесараў. «Фатаграфіі могуць распавесці, наглядна адлюстраваць і захаваць гісторыю любой падзеі. Гэтым абумоўлена мэта стварэння сайта-фотаархіва БДУ», – удакладняе начальнік Медыяцэнтра БДУ *Павел Салаўёў*. На сёння ў лічбавым фотаархіве больш за 20 000 фатаграфій, каля 800 калекцый. Большасць падзей на фатаграфіях аднаўлялася па матэрыялах газеты «Універсітэт», якая выдаецца з 1929 года. Даваенныя здымкі БДУ і інфармацыя пра іх прадстаўлена супрацоўнікамі гістарычнага факультэта і Музея гісторыі БДУ.

Электронны фотаархіў распрацаваны Фундаментальнай бібліятэкай і Медыяцэнтрам. Сайт пабудаваны на сістэме DSpace, на якой у БДУ ўжо функцыянуе Электронная бібліятэка. Фотаархіў увесь час абнаўляецца, і неўзабаве яго базу дапоўняць дакументы факультэтаў, інстытутаў і іншых падраздзяленняў універсітэта.

Адрас лічбавага фотаархіва – **www.earchives.bsu.by.**

Ксенія КАРАВАЯ

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

2 лютага Камлюк Лілія Васільеўна, прафесар кафедры агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі

4 лютага Пабягайла Аляксандр Паўлавіч, дацэнт кафедры тэхналогій праграмавання

4 лютага Яблонскі Алег Паўлавіч, дацэнт кафедры функцыянальнага аналізу

8 лютага Кенька Міхась Паўлавіч, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры

11 лютага Несцерава Аксана Львоўна, дацэнт кафедры агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі

19 лютага Сіцко Генадзь Мікалаевіч, дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі

21 лютага Зарэмба Вольга Сяргееўна, дацэнт кафедры класічнай філалогіі

23 лютага Сініла Галіна Веніямінаўна, прафесар кафедры культуралогіі

24 лютага Озем Генадзь Зянонавіч, загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў садружнасці

26 лютага Іўлеў Генадзь Дзмітрыевіч, вядучы навуковы супрацоўнік НДЛ матэрыялаў і прыборных структур мікра- і макраэканомікі

26 лютага Абрамава Яўгенія Ільінічна, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай

27 лютага Гербік Людміла Францаўна, загадчык кафедры прыкладной лінгвістыкі

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: класічнай філалогіі, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, тэарэтычнай фізікі і астрафізікі, фізікі цвёрдага цела, вышэйшай матэматыкі, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, тэарэтычнай і прыкладной механікі, біяхіміі, заалогіі, раманскага мовазнаўства, рускай мовы, тэорыі літаратуры, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, крыніцазнаўства, экалагічнага і аграрнага права, псіхалогіі, сацыяльнай камунікацыі, філасофіі і метадалогіі навукі, інавацыйнага менеджменту, міжнароднага турызму, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, тэорыі функцый, прыкладной лінгвістыкі, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, эканамічнай інфарматыкі, міжнародных эканамічных адносін;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскага мовазнаўства, псіхалогіі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а,
упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н.СЕЎЧАНКІ» БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 01.04.01 прыборы і метады эксперыментальнай фізікі.

Тэрмін конкурсу – месяц з дня апублікавання аб'явы.
Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7.
Тэлефон: 212-48-43

«ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ» БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі аналітычных даследаванняў;

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі нанаэлектрамагнетызму.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў,
пакой 315, тэл. 226 42 31.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

У БДУ пачаў працу лічбавы фотаархіў універсітэта – interfax.by (03.01), Tut.by, edu.gov.by (04.01).

Навукоўцы БДУ распрацавалі новую тэхналогію атрымання субстанцыі лекавага прэпарата крэацінфасфату – minsknews.by (04.01).

Шматфункцыянальныя ветэрынарныя прэпараты для лячэння і прафілактыкі хвароб сельскагаспадарчых і хатніх жывёл распрацаваны ў БДУ – minsknews.by, edu.gov.by/news, soyuz.by, БелаПАН, БелТА (09.01).

Міжнародны семінар «Міжнародныя рэйтынгі як прылада інтэрнацыяналізацыі ўніверсітэтаў» – ecopress.by, wuz.by (05.01), zviazda.by (06.01), Мінск-ТБ, БТ-1, minsknews.by, «СБ-Беларусь сёння», БелаПАН, naviny.by, АНТ, БелТА (09.01).

Каментары адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ Вячаслава Малафеева рэспубліканскім СМІ пра змену правіл прыёмнай кампаніі 2017 года – АНТ, minsknews.by (09.01), БелТА, interfax.by, mail.ru, mk.by, «Мінскі кур'ер», 24.kg, zviazda.by (10.01), «Звязда» (11.01).

Стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 2017 год прызначаны 11 аспірантам БДУ – interfax.by, БелТА, edu.gov.by/news (09.01), sb.by (10.01).

Праект сістэмы дыстанцыйнага кардыяманіторынгу «Начны дазор» распрацаваны ў БДУ – «Звязда», interfax.by, health.ej.by, zviazda.by, belarus.by, soyuz.by, wuz.by, ecopress.by, newspile.ru, БелаПАН, minsknews.by, edu.gov.by/news (11.01), Мінск-ТБ, БТ-1, so-l.ru, АНТ, med.by (13.01), densegodnya.ru, sb.by, БелТА (16.01), vitebsk-region.gov.by, mk.by, l-a.by (17.01).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

АКТУАЛЬНА

Для чаго ў БДУ патрэбныя турнікеты?

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў і ўказамі Прэзідэнта Беларусі, якія заклікаюць узмацніць кантроль бяспекі ў месцах масавага збору людзей, у БДУ ажыццяўляецца ўкараненне сістэмы кантролю і кіравання доступам. Ахоўнікаў, якія правяраюць дакументы на ўваходзе на тэрыторыю кампуса і карпусоў БДУ, з цягам часу заменяць турнікеты і сістэма відэаназірання. У асобных, найбольш датыкальных, месцах змены можна будзе пабачыць неўзабаве. Чаго менавіта нам чакаць?

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

БДУ – не прахадны двор

Намеснік начальніка службы аховы і бяспекі БДУ **Андрэй ДАВЫДЗЁНАК:**

– Амаль усе ўніверсітэты Мінска аснашчаныя спецыяльнымі сродкамі (агароджамі) для абмежавання несанкцыяванага доступу на тэрыторыю. І ў нас плануецца ўсталяванне турнікетаў і сістэм відэаназірання. Забяспечваць парадак на тэрыторыі ўніверсітэта неабходна пастаянна, бо з аднаго боку ў нас вакзал, з іншага – адна з галоўных плошчаў краіны. Да стварэння службы аховы і бяспекі БДУ (якой, дарэчы, сёлета спаўняецца 20 гадоў) тут быў прахадны двор, з вакзала хто толькі ні ішоў: і бамжы, і крымінальныя элементы, хуліганы і проста нецвярозыя людзі, якім карцела заскочыць у дворык па зразумела якой патрэбе. Апрача гэтага, трэба ўлічваць міжнародную сітуацыю, тэракты ці жахлівы выпадак у ГЦ «Еўропа». Нарэшце, трэба працаваць для прафілактыкі правапарушэнняў, у асноўным крадзяжоў, якія, на жаль, здараюцца ў БДУ. Супрацоўнікі праваахоўных органаў па матэрыялах свайго разбіральніцтва зазвычай пішуць на імя рэктара прадстаўленне аб ліквідаванні прычын, што спрыяюць ажыццяўленню злачынства. Такое прадстаўленне мае пэўную юрыдычную сілу, і рэктар абавязаны рэагаваць. Адно з патрабаванняў супрацоўнікаў міліцыі – усталяванне сістэмы відэаназірання і кантролю доступу на тэрыторыі ўніверсітэта.

Спробы ўкаранення інтэграванай сістэмы фізічнай бяспекі ажыццяўляліся ў БДУ і раней, напрацоўкі ўжо ёсць. На хімфаку турнікеты стаяць з 2009 г., неўзабаве яны будуць перазапушчаны. З сакавіка 2016 г. спраўна працуюць турнікеты на Курчатава, 5 (ФРКТ), у штатным рэжыме. На ФМА ўжо дзейнічае сістэма відэаназірання. Дарэчы, у краіне існуе пэўная закадаўчая база адносна абсталявання сродкамі відэаназірання ўсіх месцаў масавага збору людзей. Такім лічыцца месца, дзе адначасова знаходзіцца больш за сто чалавек. А ў нас паточныя аўдыторыі змяшчаюць часам значна болей студэнтаў...

Усталяванне турнікетаў чакаецца ва ўсіх будынках БДУ. Прыкладваеш дакумент – у вахцёра на экране высвечваецца электронная інфармацыя студэнта ці супрацоўніка з адзінай базы дадзеных БДУ, фіксуецца час праходу. Найперш «закрываць» плануецца ўніверсітэцкі дворык: праходы праз фізічны факультэт, галоўны корпус, ФМА, брамкі і вароты з боку вуліц Ленінградскай і Бабруйскай. Сістэма відэаназірання з'явіцца раней на самых «вострых» кірунках: галоўны корпус, фізічны корпус, ФМА. У будынках БДУ, якія стаяць асобна, інтэграваная сістэма з'явіцца трохі пазней – як будуць дазваляць сродкі.

«Усе будуць задаволены»

Прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце БДУ **Уладзімір РАГАВІЦКІ:**

– Новае часта ўспрымаецца з пэўнай цяжкасцю. У «наргасе» даўно дзейнічае такая сістэма: і ў інтэрнаты, і ў вучэбныя карпусы праходзяць праз турнікеты. А ў нас многія ў штыкі ўспрынялі праверку дакументаў на ўваходзе ў комплекс БДУ, былі нападкі і на службу бяспекі, а потым усе прывыклі. На хімфаку і на ФРКТ ніхто ўжо не задае пытанняў. Сістэма ж вельмі зручная. На ФМА з дапамогай сістэмы відэаназірання была адсочана і злоўлена жанчына, якая заходзіла з вакзала і займалася крадзяжом, прафесійна.

Я шмат дзе быў – і ў Кітаі, і ў Туркменістане, і ў расійскіх універсітэтах, там паўсюль стаяць турнікеты. У Туркменістане нас прапусцілі ва ўніверсітэт толькі пасля таго, як прарэктар выйшаў сустрэць нашу дэлегацыю. Універсітэцкі дворык наш – гэта «бойкае» месца. Памятаю, калі толькі прыйшоў у БДУ, шмат гадоў таму, бомж мог ляжаць проста на парозе, так што не ўвайсці было на працу. А цяпер служба бяспекі добра працуе, і крадзяжы скараціліся ў дзясяткі разоў. Калі поўнасцю запрацуе інтэграваная сістэма фізічнай бяспекі, ва ўсіх карпусах і ў інтэрнатах, калі ўсё адладзім – мне здаецца, усе будуць задаволены.

Разумна, мякка, па-ўніверсітэцку

Начальнік Цэнтра інфармацыйных тэхналогій **Юрый ВАРАТНІЦКІ:**

– ЦІТ адказвае за тое, каб інтэграваць кантрольна-прапускную сістэму з наяўнай інфраструктурай, уключаючы пластыкавыя пасведчанні студэнтаў і супрацоўнікаў. У 2003 г. у нашых студэнтаў з'явіліся першыя ў краіне пластыкавыя студэнцкія білеты. Праз сем гадоў гэта стала агульным для ўсіх універсітэтаў краіны. Такі дакумент павінен быць шматфункцыянальным. Па замове міністэрства мы распрацоўваем новы прататып студэнцкага білета на базе банкаўскай карты, ён таксама зможа функцыянаваць у бібліятэках і кантрольна-прапускных сістэмах.

Проста так перакрыць БДУ нельга: тут праходзіць шмат масавых мерапрыемстваў – навуковыя канферэнцыі, школы юных, дзе займаюцца школьнікі, алімпіяды і інш. На некаторых мерапрыемствах шэраг наведнікаў немагчыма высветліць загадзя. На абарону дысертацый, напрыклад, мае права прайсці любы чалавек. Для такіх выпадкаў выпрацаваны адпаведны рэгламент прапускной сістэмы, і ён зроблены вельмі акуратна, каб не ствараць праблем для людзей. Напрыклад, як робяць на Курчатава, калі студэнт забыў і білет, і залікоўку: у супрацоўніка службы бяспекі ёсць доступ да базы дадзеных, ён уводзіць прозвішча няпамятлівага студэнта, бачыць фатаграфію, супастаўляе – і прапускае. Усё рашаецца разумна і мякка – я б сказаў, па-ўніверсітэцку.

Асноўная задача новаўвядзенняў – перапыніць наведванне карпусоў тымі асобамі, якія могуць прынесці шкоду, як фізічную, так і маральную. Аднойчы быў у мяне такі выпадак: затрымаўся на працы да сёмай-восьмай гадзіны ўвечары, і да мяне прыйшоў чалавек з просьбай адправіць факс у адміністрацыю Прэзідэнта з дапамогай камп'ютарнай мышкі. Ладны такі чалавек. Давялося званіць у службу бяспекі, прасіць зайсці – дапамагчы «факс адправіць». Мяне правільна зразумелі: прыйшлі два дужыя супрацоўнікі, «дапамаглі». Але адчуванні, прызнацца, былі не вельмі прыемныя, калі з табой самнасам у пакоі сапраўдны псіх.

Ветлівае жалеза

Аператыўны дзяжурны **Аляксандр ПЕТРАШКЕВІЧ**, галоўны корпус БДУ:

– Турнікеты, вядома, значна аблегчылі б нашу штодзённую працу. Калі патрабуеш паказаць дакументы, то сутыкаешся з рознымі эмацыйнымі рэакцыямі, усялякае можна пачуць. Асабліва абураецца старэйшае пакаленне – маўляў, я тут ледзь не нарадзіўся і вырас у БДУ, а раптам вы, ахоўнікі-вартаўнікі, намаляваліся і пропуск патрабуеце... З «жалезам» усё атрымалася б ветлівей.

Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

НАВАЦЫІ

Газета «Універсітэт» становіцца мультымедыйным выданнем

Шаноўныя чытачы, наша газета імкліва эвалюцыянуе і набывае элементы мультымедыйнага выдання з дапамогай тэхналогій дапоўненай (змешанай) рэальнасці.

Пры навядзенні камеры смартфона або планшэта на малюнак з пазнакай, на экране пачынаецца прайграванне дадатковага кантэнту – відэа, фота, анімаваных малюнкаў, 3D-графікі і інш. Дадзены эфект можна метафарычна назваць «ажыўленнем» газетнай паласы, што робіць газетныя публікацыі больш інфарматыўнымі і запамінальнымі.

КАБ ПАГЛЯДЗЕЦЬ МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫ КАНТЭНТ ГАЗЕТЫ «УНІВЕРСІТЭТ»:

1. *Спампуйце бясплатнае прыкладанне* **Aurasma** *ў PlayMarket (для Android) / AppStore (для iPhone).*

2. *На ўкладцы Пошук (Search) набярыце* **#bsuby** *і падпішыцеся на канал БДУ (націсніце FOLLOW).*

3. *Вярніцеся на ўкладку Прагляд , навядзіце камеру тэлефона (планшэта) на выяву са спецыяльным значком і пачакайце загрузкі мультымедыйнага кантэнту.*

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

26 студзеня 2017 года
Падпісана да друку 24.01.2017 г.
Зак. 25. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by